УДК 726.01 (476)

# Асноўныя планіровачныя схемы сучасных праваслаўных храмаў

Арабей В.Г.
Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт

Грунтуючыся на аналізе і супастаўленні планіровачных схем храмі мінулага і сучаснага намі прапануецца наступная дыферэнцыяц будынкаў цэркваў паводле: формы, структуры, кампазіцыі плана, колька нэфаў і слупоў.

***Форма плана*** сучасных праваслаўных храмаў, а менавіта маліто залы, прадстаўлена 5 асноўнымі тыпамі: 1) квадратны; 2) прамавугольн 3) крыжовы; 4) круглы; 5) шматвугольны.

У кожнага з тыпаў ёсць адмысловае семантычнае значэнне. Бажн якая мае ў аснаванні крыж, стала асновай для стварэння крыж купальнага тыпа храма, які ў найвялікшай ступені сканцэнтраваў у с багаслоўскую канцэпцыю праваслаўнай царквы.

Асноўную масу культавых пабудоў Беларусі складаюць храмы прамавугольнай, крыжовай і квадратнай формай плану.

***Структура плана*** сучасных праваслаўных храмаў дае прыклады 1-2 4 і шматчастковых пабудоў. За частку прымаюцца такія планіровачн элементы як: а) апсіда, малітоўная зала, трапеза, бабінец (асноўныя); рызніца, панамарка, хрысціільня і г.д. (дадатковыя).

***Кампазіцыя*** планаў сучасных праваслаўных храмаў прадстаўле двума асноўнымі варыянтамі, цэнтрычным і прадольна-восевым, для як характэрна сіметрыя; і адным дадатковым – нерэгулярным, які вылучае асіметрычнасцю.

Для цэнтрычнага рашэння ўласціва статычнасць плана і развіцц вертыкальнай восі. Прадольна-восевую кампазіцыю характары дынамізм і развіццё па восі захад-усход. Для храмаў з нерэгуляр кампазіцыяй характэрна экспрэсія, дамінуюць рашэнні з развіццём вертыкальнай восі.

***Колькасць нэфаў*** сучасных праваслаўных храмаў – 1, 3 і 5. Як прав дадзеная характарыстыка адлюстроўвае геаметрычныя памеры пабудо ўмяшчальнасць, з павелічэннем якіх узрастае колькасць нэфаў.

Другая, не менш важная якасць, якая ўплывае на колькасць нэфа узровень рэпрэзентатыўнасці будынка.

***Колькасць слупоў наоса*** сучасных праваслаўных храмаў прадстаўлен асноўнымі тыпамі: бесслуповы, двухслуповы, чатырохслупов шасціслуповы, васьміслуповы. Тэндэнцыя павелічэння колькасці слупо сведчыць аб павелічэнні памераў і колькасці нэфаў храма, пашыр структуры.